# З НОВЫМ ГОДАМ, СЯБРЫ!

ПРАЛЕТАРЫІ ЎСІХ КРАІН, ЯДНАЙЦЕСЯ!

# БЕЛАРУСКІ УНІВЕРСІТЭТ

ОРГАН ПАРТКОМА, РЭКТАРАТА, КАМСАМОЛЬСКАГА І ПРАФСАЮЗНЫХ КАМІТЭТАЎ БЕЛАРУСКАГА ОРДЭНА ПРАЦОЎНАГА ЧЫРВОНАГА СЦЯГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА ІМЯ У. І. ЛЕНІНА

ГАЗЕТА ЎЗНАГАРОДЖАНА ГАНАРОВАЙ ГРАМАТАЙ ВЯРХОЎНАГА САВЕТА БССР

1985
26
СНЕЖНЯ
ЧАЦВЕР
№ 36 (1486)

ВЫДАЕЦЦА З 1922 ГОДА

БЕЛАРУСКІ УНІВЕРСІТЭТ

## ТЭЛЕТАЙП

*УЧОРА · СЁННЯ · ЗАЎТРА*

### *РАПАРТ СТУДЭНЦТВА*

*універсітэта XXVII з'езду КПСС падпішуць лепшыя з лепшых. У сувязі з гэтым ва універсітэце шырока разгорнута сацыялістычнае спаборніцтва за права падпісаць рапарт. Яно будзе прадастаўлена выдатнікам вучобы, ленінскім стыпендыятам, прафсаюзным і камсамольскім актывістам.*

*І. СУХАРАВА.*

### *РАЗНАСТАЙНЫЯ ФОРМЫ*

*пазааудыторнай работы са студэнтамі шырока выкарыстоўваюць на кафедры марксісцка-ленінскай філасофіі гуманітарных факультэтаў. Так, у інтэрнаце № 1 прайшла дыскусія на базе студэнцкага навуковага гуртка «Філасаф» па тэме «Я — філасаф». Прадметам ажыўленага абмеркавання стала пытанне аб суадносінах прафесійных арыентацый студэнтаў-філасафаў і іх светапоглядных прынцыпаў. У размове прынялі ўдзел і замежныя студэнты.*

*На базе дыскусійнага клуба «Філасофія і культура» адбыўся «круглы стол» студэнтаў філасофскага аддзялення сумесна з курсантамі МВВАПВ. У рабоце «круглага стала» прынялі ўдзел супрацоўнікі Інстытута мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору АН БССР. У музеі інстытута адбылася дыскусія на тэму «Паўсядзённая свядомасць, яе структура і функцыі».*

*А. РЫБКІН.*

### *СЁННЯ*

*пленум камітэта камсамола універсітэта абмяркуе дзейнасць камсамольскіх арганізацый ФПМ і геаграфічнага факультэта па павышэнню адказнасці камсамольцаў за якасць ведаў, глыбокае і дасканалае авалоданне выбранай спецыяльнасцю і задачы камсамольскіх арганізацый у справе падрыхтоўкі і выхавання ідэйна перакананых, высокакваліфікаваных спецыялістаў.*

*А. ГУТАВЕЦ.*

### *СЁННЯ*

*у актавай зале БДУ пройдзе спартыўны вечар. На ім будуць аб'яўлены вынікі XXXIII круглагадовай спартакіяды. Студэнтаў чакаюць цікавыя сустрэчы з трохразовым чэмпіёнам Алімпійскіх гульняў А. Мядзведзем, старшым трэнерам баскетбалістаў РТІ А. Шукшыным, старшынёй федэрацыі цяжкай атлетыкі БССР, лаўрэатам прэміі Ленінскага камсамола, народным артыстам БССР І. Лучанком. Будзе дэманстравацца мастацкі фільм, для жадаючых — працуе дыскатэка.*

*С. МАКАРЭВІЧ.*

КУРС — ПАСКАРЭННЕ

## ВУЧОНЫЯ УНІВЕРСІТЭТА НА ВЫСТАЎКАХ

АДЗІНАЦЦАТАЯ ПЯЦІГОДКА адзначана поспехамі універсітэцкай навукі на міжнародных і ўсесаюзных выстаўках і аглядах. Распрацоўкі універсітэта дэманстраваліся на 20 выстаўках, у тым ліку і за мяжой. Для гэтых мэт было створана звыш 150 экспанатаў: прыборы, стэнды, макеты. Супрацоўнікамі універсітэта атрымана звыш 40 медалёў ВДНГ СССР, 80 дыпломаў ВДНГ БССР.

Важна і тое, што нашы вучоныя прымаюць самы непасрэдны ўдзел у распрацоўцы тых праграм інтэнсіфікацыі, якія ў цяперашні момант ставяцца на пярэдні край. На XXVIII справаздачна-выбарнай партыйнай канферэнцыі г. Мінска перад дэлегатамі экспанаваліся і распрацоўкі вучоных нашага універсітэта. Гэта і новыя тэхналагічныя прыёмы нанясення алюмініевых пакрыццяў, і камплект іёнаселектыўных электродаў, і распрацоўкі ў галіне біятэхналогіі, у прыватнасці высокаэфектыўны спосаб ачысткі сцёкавых вод прадпрыемстваў (мясакамбінатаў) з мэтай далейшага атрымання з адходаў высокапрадукцыйных кармавых прэпаратаў.

У XII пяцігодцы навуковыя распрацоўкі нашых вучоных будуць таксама шырока прадстаўлены на выстаўках. Так, напрыклад, у 1986 годзе супрацоўнікі універсітэта прымуць удзел у міжнароднай выстаўцы «Навука, тэхніка і эканоміка Беларускай ССР» (ПНР), у 1987 годзе — у нацыянальнай выстаўцы СССР у Фінляндыі і іншых.

*С. ЖАРКО, А. ПАДАЛКА.*




ДАТЫЧЫЦЬ УСІХ І КОЖНАГА

## Мір дабрынёю зберагчы

— НЯХАЙ людзі ўсяго свету будуць шчаслівымі. Я хачу, каб дзеці ўсёй зямлі і іх бацькі ніколі не ведалі бяды. Я хачу, каб савецкі народ і ўсе народы планеты жылі ў трывалым міры.

Гэтыя простыя словы зразумелыя кожнаму. Але ці кожны разумее, што можа зрабіць ён для таго, каб зберагчы мір? Ці асэнсоўвае, што з намаганняў адзінак, са слоў, сказаных ціха, але ўпэўнена, складаецца голас мільёнаў. Голас міру.

Галіна Мікалаеўна Бяляева, супрацоўнік вылічальнага цэнтра уінверсітэта не проста разумее гэта. Яна дваццаць адзін год працуе на вылічальным цэнтры і ўжо доўгія гады знаходзіцца ў радах самых актыўных барацьбітоў за мір. Гэта жанчына пастаянна пераводзіць грошы ў Фонд міру. Вядзе актыўную агітацыю, далучаючы да радоў міралюбівага руху ўсё новых і новых удзельнікаў.

Яе добрыя вочы і, між тым, упэўненая манера гаварыць пакідаюць вялікае ўражанне. У гутарцы з ёю субяседнік адчувае, як яго пакідае паўсядзённая, дробязная мітусня. Галіна Мікалаеўна пераконвае не толькі сваім пранікнёным словам, але і справай. Справай простай, справай, якую яна лічыць неабходнай.

— Кожны год, да канца свайго жыцця, у Дзень абароны дзяцей, 1 чэрвеня, буду пераводзіць грошы ў Фонд міру. Я гляджу на дзяцей і вельмі радуюся за іх. А яшчэ хвалююся. Не хачу, каб дабрабыт зачыніў іх душы, ізаляваў ад свету, якому вельмі патрэбна дапамога ў добрым слове, у абароне. Таму я іду да дзяцей, да школьнікаў, і тут мне першыя памочнікі мае ўнукі.

Галіна Мікалаеўна часта бывае ў школах, шмат робіць па месцы жыхарства. У барацьбе за мір удзельнічаюць тры пакаленні Бяляевых: Галіна Мікалаеўна і яе муж, дзеці, унукі. Зараз Бяляевы хочуць арганізаваць збор сродкаў для дзяцей рэвалюцыйнай Нікарагуа.

Дабрыня, добрая воля простых людзей здольны зберагчы мір.

І так будзе. Галіна Мікалаеўна Бяляева верыць у гэта. Яна перакананы чалавек і нясе гэта перакананне тым, хто побач з ёю.

А. ПАТРЭБІН,
студэнт факультэта журналістыкі.

## ВІНШУЕМ!

*ПАДВЕДЗЕНЫ ВЫНІКІ агляду-конкурсу вучэбных груп Белдзяржуніверсітэта імя У. І. Леніна за 1984—1985 вучэбны год. Першае месца прысуджана групе IV курса аддзялення філасофіі гістарычнага факультэта (камсорг Н. Антановіч, прафорг У. Глушакоў). На другім месцы — IV група III курса геаграфічнага факультэта (камсорг В. Сечка, прафорг В. Яўдорава). Трэцяе месца заняла III група III курса хімічнага факультэта (камсорг А. Філіпава, прафорг І. Сухарава).*

*Групы-прызёры агляду-конкурсу будуць сфатаграфаваны ля разгорнутага сцяга камсамольскай арганізацыі БДУ і занесены на універсітэцкую Дошку гонару. Яны ўзнагароджаны таксама экскурсійнымі паездкамі ў Ленінград, Кіеў, Рыгу і грашовымі прэміямі.*

*Адзначаны таксама І група IV курса юрыдычнага факультэта, VI група IV курса філалагічнага факультэта, XI група IV курса механіка-матэматычнага факультэта, заняўшыя месцы з чацвёртага па шостае. Яны ўзнагароджаны экскурсійнымі паездкамі па месцах рэвалюцыйнай, баявой і працоўнай славы Беларусі.*

*Патрэбна таксама падкрэсліць, што згодна з Палажэннем аб аглядзе-конкурсе студэнты ўсіх груп, заняўшых першыя месцы на факультэтах, забяспечваюцца стыпендыяй на 100 працэнтаў. Усе іншагароднія з гэтых груп забяспечваюцца месцамі ў інтэрнаце.*

*А. ШЫБУТ,*
*адказны за сектар сацыялістычнага спаборніцтва камітэта камсамола.*

Універсітэцкая шматтыражка адрасавана перш за ўсё студэнтам. Таму рэдакцыя звярнулася да сваіх асноўных чытачоў з просьбай даць ацэнку газеце і, каб даведацца, аб чым хацелі б яны чытаць у новым, 1986 годзе. З гэтай мэтай наш карэспандэнт В. ГРАМОВІЧ узяў «Рэпарцёр» і адправіўся па факультэтах.

# «БЕЛАРУСКІ УНІВЕРСІТЭТ» — 86

## ДЫЯЛОГ З ЧЫТАЧОМ

**КАР.: Наколькі рэгулярна чытаеце Вы газету «Беларускі універсітэт»?**

*Ігар Каранкевіч, студэнт III курса юрыдычнага факультэта:* Чытаю рэгулярна і з задавальненнем. Асабліва артыкулы пра цікавых людзей універсітэта. Вельмі спадабаліся матэрыялы аб маіх аднакурсніках Анатолю Смірнову і Аляксандру Дземяшкевічу, якія да паступлення у БДУ, у час службы ў арміі выконвалі інтэрнацыянальны абавязак у Дэмакратычнай Рэспубліцы Афганістан.

*Ірына Комар, студэнтка V курса механіка-матэматычнага факультэта:* Чытаю, але не рэгулярна.

**КАР.: Што запомнілася сёлета?**

*І. Комар:* Матэрыялы штаба «Камсамольскага пражэктара».

*Людміла Мартынчук, студэнтка IV курса рускага аддзялення філалагічнага факультэта:* Нумары газеты выходзяць цікавымі, але, на жаль, гэта бывае не так часта, як хацелася б. З задавальненнем чытаю матэрыялы пра здачу сесіі не толькі студэнтамі-філолагамі, але і іншых факультэтаў. Таму што мы знаходзімся на «водшыбе», і цікава, як ідуць справы ў другіх калектывах.

*Максім Гелін, студэнт II курса фізічнага факультэта:* На жаль, вельмі рэдка трапляе ў рукі свежы нумар нашай шматыражкі. Вось толькі калі вісіць на стэндзе — пачытаеш своечасова.

**Заўвагу другакурсніка карэспандэнт перадаў сакратару камітэта камсамола фізфака Ігару Ганчаронку. Ён адказаў: «Газеты заўсёды ляжаць у пакоі камітэта камсамола, іншая справа, што камсорг групы, дзе вучыцца М. Гелін, не заўсёды прыходзіць своечасова за імі».**

**КАР.: Роўна год назад газета пачала выходзіць у два колеры. Ваша думка аб афармленні нумароў?**

*Марына Марозава, студэнтка III курса фізічнага факультэта:* Розніца, вядома, ёсць. Ва ўсякім разе, на маю думку, калі газета маляўнічая, яе прыемна ўзяць у рукі.

*Галіна Навасёлава, студэнтка V курса гэтага ж факультэта:* Нумары пачалі адрозніваецца адзін ад аднаго.

**КАР.: Толькі колерам?**

*І. Навасёлава:* Не толькі. Але і знешняе афармленне таксама адыгрывае сваю ролю.

**КАР.: З кім з цікавых людзей універсітэта вы жадалі б сустрэцца на старонках «БУ», пра што пачытаць?**

*І. Каранкевіч:* З Галінай Савіцкай, баскетбалісткай мінскага «Гарызонта», студэнткай факультэта журналістыкі.

*І. Навасёлава:* Пажадана было б пачытаць выступленні адказных за культурна-масавую работу на розных факультэтах. Думаецца, трэба больш увагі надаваць дзейнасці бібліятэкі, прапагандзе і знаёмству з новымі кнігамі, якія паступаюць у яе фонды.

*Ірына Крэтовіч, сакратар камітэта камсамола філалагічнага факультэта:* Лічу, што найперш павінны распрацоўвацца тэмы, якія датычацца жыцця груп. Пакуль падобныя матэрыялы рэдка выходзяць у «БУ». Амаль не асвятляе газета работу ў інтэрнаце, не знаходзіць свайго адлюстравання праблема студэнцкага самакіравання.

**КАР.: Што рэдакцыя газеты павінна пакінуць у старым, 1985 годзе?**

*Наташа Германовіч, студэнтка IV курса хімічнага факультэта:* Сухую мову. Студэнцкая газета павінна быць не толькі цікавай па свайму зместу, але і падачай фактуры.

**КАР.: Якіх матэрыялаў, на якія тэмы не хапае газеце?**

*Наташа Калішук, студэнтка III курса механіка-матэматычнага факультэта:* Трэба, на маю думку, паболей змяшчаць матэрыялаў непасрэдна аб факультэце ці групе, а не ўвогуле аб універсітэце, як гэта часам мае месца ў газеце. Прадастаўляць слова студэнтам розных факультэтаў. А то манаполію на аўтарства трывала і надоўга, здаецца, захапіў журфак.

*Г. Навасёлава:* Мне здаецца, на старонках газеты было б не залішне рыхтаваць студэнтаў да размеркавання, самастойнай працы. Таму што многія з нас падыходзяць да сваёй фінішнай рысы і не зусім уяўляюць, чым будуць займацца на вытворчасці. Хацелася б паболей бачыць матэрыялаў аб выпускніках універсітэта, аб клопатах і праблемах маладых спецыялістаў.

*І. Комар:* Аб студэнцкім жыцці ў інтэрнаце, бо тут студэнт праводзіць значную, калі не пераважную частку свайго часу. Было б добра, калі б паболей і падрабязней расказвалі пра розныя факультэты.

*М. Марозава:* Мы — студэнты. Натуральна, што больш за ўсё нас хвалююць тэмы, звязаныя са студэнцтвам. І не толькі аб вучобе, але і дзейнасці гуртоў, факультэце грамадскіх прафесій, аб тым, як праводзяць свой вольны час студэнты розных факультэтаў.

**КАР.: Гэта так званыя матэрыялы інфармацыйнага характару. А якія студэнцкія праблемы для вас з'яўляюцца найбольш актуальнымі?**

*М. Марозава:* Праблема недахопу часу. Таму што нярэдка студэнтам прыходзіцца займацца шэрагам спраў, ад якіх ім няма карысці. Хацелася б даведацца пра тых студэнтаў, якія вырашылі гэту праблему для сябе.

**АД РЭДАКЦЫІ.** Натуральна, перадаць усё, аб чым ішла гаворка у час апытання чытачоў, немагчыма з-за абмежаванасці газетнай плошчы. Таму мы прывялі адказы найбольш характэрныя, найбольш тыповыя. Калі ў вас, паважаныя чытачы, з'явіцца жаданне выказаць свае думкі, заўвагі, прапановы, задаць пытанні рэдакцыі газеты, калі ласка — чакаем вашых лістоў, візітаў і тэлефонных званкоў.

## ПЕРАДСВЯТОЧНЫЯ КЛОПАТЫ



*ТРЫСТА пяцьдзесят восем, трыста пяцьдзесят дзевяць... трыста шэсцьдзесят... Яшчэ крыху, і можа будзе эскліквуць — трыста шэсцьдзесят пяць! І, нарэшце — свята!*

*А пакуль у запасе ёсць пяць дзён. Такіх неабходных, каб разлічыцца з усімі запазыкамі і «хвастамі» (вядома, у каго яны яшчэ засталіся).*

*Пяць дзён! Так шмат! Іншаму хопіць іх, каб прывесці ў парадак справы, разабрацца з якімі было мала трохсот шасцідзесяці дзён...*

*Але галоўнае, што чакае кожнага з нас, прыемныя клопаты аб надыходзячым святе. Вось, напрыклад, вы набылі ўжо ёлку?*

*Калі не — не адчайвайцеся. У святочную ноч можна арганізаваць навагодні карагод вакол лясной прыгажуні, што ўстаноўлена непадалёку ад вашага інтэрната на плошчы.*

*Фота В. КАРАЛЯ.*







## СЛОВА — ДЭКАНУ

# «ЗАСТАВАЦЦА ЧАЛАВЕКАМ»

**Так ужо вядзецца спрадвеку, што пад Новы год людзі падводзяць рысу падзеям, якія адбыліся за год стары, і намячаюць сабе новыя рубяжы і планы. Імення аб гэтым ішла гаворка нашага карэспандэнта з дэканам юрыдычнага факультэта доктарам юрыдычных навук В. Г. ЦІХІНЯЙ.**

— Чым быў знамянальны мінулы год?

— Усе нашы намаганні былі накіраваны на далейшае павышэнне эфектыўнасці і якасці вучэбна-выхаваўчага працэсу, значна ўзрасла роля фундаментальных ведаў у прафесійнай падрыхтоўцы юрыдычных кадраў. Мы глыбей сталі вывучаць са студэнтамі маральны змест права, а таксама яго выхаваўчую ролю. Студэнты першага курса ва ўрачыстых абставінах далі клятву на вернасць маральным прынцыпам працы юрыста. На факультэце ўведзены новыя спецкурсы, якія прысвечаны прафесійнай этыцы савецкага юрыста.

Мы ганарымся тым, што маем усё неабходнае, каб паспяхова працаваць. Сёння на юрфаку вучыцца каля чатырохсот медалістаў, гэта значыць амаль кожны другі студэнт дзённага аддзялення. Гэта — наш залаты фонд.

У гэтым годзе дзве трэці студэнтаў вучыліся толькі на «добра» і «выдатна». Выкладчыкі і студэнты прымалі актыўны ўдзел у прапагандзе Закона аб працоўных калектывах і новага антыалкагольнага заканадаўства. Каля сямідзесяці працэнтаў студэнтаў працуюць на грамадскіх асновах у праваахоўных органах Мінска.

— А для вас асабіста?

— Асабіста для мяне мінулы год быў даволі плённым. У Ленінградскім дзяржаўным універсітэце імя А. А. Жданава абараніў дысертацыю. У кастрычніку рашэннем ВАК пры Савеце Міністраў СССР мне была прысуджана вучоная ступень доктара юрыдычных навук. Вялікай падзеяй стаў удзел у рабоце справаздачна-выбарнай партыйнай канферэнцыі Белдзяржуніверсітэта.

**— Якія задачы належыць рашаць факультэту ў новым годзе?**

— Нягледзячы на тое, што ў мінулым годзе было зроблена шмат, аднак, напэўна, яшчэ больш трэба зрабіць. Свае намаганні ў новым годзе мы думаем накіраваць на нявырашаныя праблемы, а ў нас іх нямала. Вялікую ўвагу трэба надаць якасным аспектам нашай работы. Больш актыўна і мэтанакіравана сёння неабходна займацца пытаннямі перабудовы кіравання вучэбным працэсам. Тут яшчэ далёка не ўсе рэзервы прыведзены ў дзеянне. Варта таксама павысіць эфектыўнасць і якасць нашых навуковых даследаванняў. У новым годзе будзем весці самую рашучую барацьбу з усімі негатыўнымі з'явамі, якія не адпавядаюць сацыялістычнаму ладу жыцця, нашай камуністычнай маралі. Усе сілы будуць аддадзены непасрэднай рабоце са студэнтамі. І словам, і справай мы павінны выхоўваць іх у духу высокай сацыялістычнай грамадзянскасці.

Новы год — гэта год XXVII з'езда нашай партыі. Мы павінны азнаменаваць гэту падзею новымі поспехамі ў вучэбнай, навуковай і выхаваўчай працы.

**— Што вы хочаце пажадаць студэнтам у новым, 1986 годзе?**

— Студэнт павінен сістэматычна займацца самавыхаваннем. Як адзначаў А. В. Луначарскі: «Неабходна кожнаму чалавеку ўмець валодаць сабой, накіроўваць сваю волю і свядомасць у патрэбны бок, неабходна, каб камуніст пераважаў над мешчанінам». Мы часцей павінны зазіраць у саміх сябе, не ківаючы пры гэтым на «аб'ектыўныя ўмовы» і на недасканаласць людзей, якія нас акружаюць. Усім нам трэба клапаціцца аб самым галоўным — заставацца Чалавекам. Апроч таго, патрэбна ўмець у жыцці адрозніваць галоўнае ад другараднага. Адмяжоўваць істотнае ад дробязей. Трэба жыць паўнакроўным жыццём: наведваць тэатры, канцэртныя залы, хадзіць у турыстычныя паходы і г. д. Студэнт — званне пачэснае, аднак яно накладае адказныя абавязкі. Няхай жа кожны з вас, хто крочыць сёння да вяршынь ведаў, з гонарам выконвае свой абавязак.

У заключэнне я хацеў бы ад усёй душы горача і сардэчна павіншаваць усіх выкладчыкаў, супрацоўнікаў і студэнтаў універсітэта з 1986 годам!

Запісаў
**В. МЫШЫНЕЦ.**




# Студэнцкія калядкі

ВЫКЛАДЧЫК універсітэта Іван Паўлавіч Ніканаў у каштоўнай норкавай шапцы і фінскім паліто шпарка вяртаўся дамоў. Стары год быў на схіле: заставаліся нейкія дзве гадзіны яго жыцця.

Раптам з завулка выступілі тры вялікія чалавечыя сілуэты. Выкладчык па дрэннасці зроку спачатку неяк не заўважыў гэты, цікавы ў некаторай ступені факт. Калі ж тры здаравенныя хлопцы, замataныя ў вялізныя шалікі па самыя вочы, пыхнулі ў твар Івану Паўлавічу тытунёвым дымком, тады толькі ён спыніўся і знізу ўгару зазірнуў у твары.

— Шапку давай,— нехаця працадзіў адзін.

Ніканаў спачатку не зразумеў, чаго ад яго хочуць, а калі да яго дайшоў сэнс гэтых страшэнных слоў, ён азірнуўся — нікога навокал, акрамя гэтых бамбізаў. Яго абурыла гэткая нечуваная нахабнасць незнаёмцаў.

— Не дам! — адказаў ён і на ўсякі выпадак зняў шапку і хуценька паклаў у партфель.

— Тады партфель давай,— незласліва сказаў другі.

Трэці дадаў:

— І паліто.

Ніканаў уявіў, як у дваццаціградусны мароз пойдзе дамоў без паліто і шапкі, і ў яго заклацалі зубы. «Мусіць, ад холаду», — мільганула думка, і ён шмыгнуў носам.

— Дзядуля,— строга працадзіў адзін,— давай, давай, мілы,— і пацягнуўся за партфелем.

Старычок раптам ажывіўся.

— Не дачакаешся! — крыкнуў ён і паказаў маленькі кулак, убачыўшы непадалёку прахожага.

Прахожы, студэнт, анямеў ад убачанай сцэны і, пазнаўшы свайго выкладчыка, яшчэ некаторы час пахістаўся, а потым рашуча накіраваўся да хуліганаў.

— Адчапіцеся ад яго! — голас Яўгена зрываўся на высокіх нотах.— А то!.. Кепска будзе!..

— А ты, маленькі,— звярнуўся адзін «шалік» да студэнта,— шлёпай Новы год сустракаць, а мы з дзядзькам як-небудзь самі дамовімся.

Другі «шалік» нечакана размахнуўся і... штурхнуў Яўгена ў плячо.

— Ах так, ах так! — і з крыкам «не чапай прахожага!» рынуўся Яўген насустрач. Рэзкімі ўдарамі рук і ног раскідаў у бакі і пусціў хуліганаў наўцёкі.

— Як магу я вам дзякаваць, малады чалавек? — спытаў Іван Паўлавіч.

— Ну, што вы,— засаромеўся Жэня, гледзячы ўніз.

— Твар нешта мне ваш здаецца знаёмым,— успамінаючы, прамовіў выкладчык.

— Так,— пачырванеў студэнт.— Я заліку вам не здаў.

— Эх, якія ж праблемы! — узрадаваўся Ніканаў.— Можаце лічыць, што ён у вас ёсць!

— Дзякуй,— сціпла сказаў студэнт Жэня і дастаў залікоўку.

Калі выкладчык быў ужо далёка, да Жэні, які адзінока стаяў сярод завулка і шчасліва ўсміхаўся, падышлі тры хлопцы.

— Ну, як? Паставіў?

— Цудоўна!

— Тады пайшлі дэкана сустракаць,— сказаў адзін з іх,— ён мяне за пропускі абяцаў адлічыць...

# «Зайка»— звер хітры

*ВУЧУСЯ Я НА ГІСТАРЫЧНЫМ. А ўвогуле працую кантралёрам на гарадскім транспарце. Гэта не жарт. Я — завочнік. Цяпер вы не здзіўляецеся мусіць? Чаму здзіўляцца — у нас вучацца людзі самых шматлікіх прафесій: слесары, токары, нянечка, мадэльер, повар. ёсць нават свой шавец. Але сёння хачу расказаць не пра сваю вучобу ці сакурснікаў. Я раскажу пра сваю працу, якую палюбіў усёй душой.*

*Некаторым яна здаецца занадта лёгкай. Таму не аднойчы прыходзілася пачуць за сваімі плячыма: «Яму на будоўлі б працаваць!» Я не крыўдую. Калі добра працаваць кантралёрам — можна атрымліваць не менш, чым на будоўлі. Бо праца ў нас здзельная і, дарэчы, залежыць ад працэнта адлоўленых «зайцаў».*

*А «зайцы» цяпер хітрыя пайшлі. На якія толькі хітрыкі не пускаюцца, каб праехаць з шыкам ды без аплаты! То хворымі прыкідваюцца, то вочы хуценька заплюшчваюць, як мяне забачаць. Некаторыя глуханямымі прыкідваюцца ці дуракаватымі. Аднак апошніх ад натуральных я ўжо навучыўся адрозніваць. Яны падобны адзін на аднаго ў сваёй методыцы: звядуць вочы да носа ці ўгару і нешта сабе нашэптваюць. Не, я не сцвярджаю, што гэтак паводзяць сябе ўсе ў цяжкім становішчы. Часцей за ўсё такім акцёрствам займаюцца школьнікі ці студэнты. Прынамсі, што заўважыў, «заяц»-студэнт з БДУ лепшы за ўсіх. Інтэлігентны, быццам. Ён адразу чырванее і пачынае скрэбсці дробязь. Рэдка хто з іх спрабуе зманіць: «У аптэку за лякарствам бабулі спяшаюся». Тады я адразу: «Дзе рэцэпт?» Зразумела, рэцэпт у другім паліто застаўся.*

*За гады працы пабачыў шмат цікавых пасажыраў. Напрыклад, ёсць такія, якім падабаецца прабіваць талончык двойчы. Ужываюцца два спосабы: прабіць першы раз лёгенька, а другі — моцна ці склеіць дзірачкі слінай. Аднойчы бачыў у дзяўчынкі дзіўны блакноцік. Яна хутка заўважыла, што карыстаецца аднымі і тымі ж тралейбусамі раніцай і ўвечары. Дык яна перапісала сабе кожны нумар тралейбуса, паклала побач адпаведны талончык. Цікавы блакноцік. Заўвагі я ёй не змог зрабіць. Бо пісаных правілаў яна не парушала.*

*Добра, што п'яных менш стала. Нап'юцца зімой ды ў цяпло лезуць. Уваляцца ў транспарт, ім і месца ўступяць яшчэ, толькі галава цяжкая хістаецца. Высадзіць такога — рады не дасі.*

*Аднойчы, памятаю, заходжу ў салон. Нейкі п'яны трымаецца за жалезны карніз, які вёз пасажыр па-бач, быццам за сапраўдны поручань. «Грамадзянін, які трымаецца за карніз, ваш білет». А ён у адказ: «Торро». Я не зразумеў. Зноў яму пра білет, а ён мне пра нейкае «торро». Падумаў крыху і дадаў: «Гіспаньёла. Буэна-Айрас. Санча-Панча». Пасля такога дапаўнення я зразумеў, пра што ён. З-за мяжы сябе перада мной прадстаўляе. Іспанцам. Гэта трэба ж так набрацца, што родную мову забыцца!*

*Мог бы вам шмат расказваць гэткіх кантралёрскіх назіранняў. Упэўнены, вы мне таксама. Але хачу паведаміць вам адзін сакрэт. З 1 студзеня 1986 года набываюць сілу новыя правілы па барацьбе з безбілетнікамі. Ім будзе забаронена ехаць седзячы. А пры паўторным безбілетным праездзе штраф не спагаяецца, замест яго — дзве гадзіны працы ў дэпо па прыбіранню салонаў. Відаць, гэта будзе суровым спагнаннем. Але можа тады «зайцаў» паменшае, і я змагу заняцца грунтоўна гісторыяй.*




# Тры хвіліны на разважанне

ДА НОВАГА ГОДА заставалася роўна тры мінуты. Кузін позіркам акінуў сяброў і родных і адчуў, як яго ахапіла незразумелае хваляванне, такое ж, як і год назад.

Праз тры мінуты стары год скончыцца і ўсё жыццё працягнецца ў наступным. І што не зроблена ў гэтым, трэба зрабіць у новым. Па-першае, кінуць курыць, жонка, і тая кінула. Цяпер кожны дзень пілуе. Па-другое, у цёшчы рамонт зрабіць ці хаця б разетку новую ў кухні паставіць, каб яе токам трэсці перастала. А па-трэцяе, схадзіць да сына ў школу. Тры гады ўжо ў яго не быў.

Кузін паглядзеў на гадзіннік. Заставалася менш мінуты. І раптам успомніў, што якраз тое ж самае ён думаў і ў мінулую навагоднюю ноч...



# Навіны студгарадка

АВАРЫЙНЫ стан маста па вуліцы Кастрычніцкай вымусіў будаўнікоў спыніць дарожны рух. Амаль месяц працягвалася барацьба з суровай стыхіяй: кожную раніцу рабочыя ўпарта падымалі агароджу, якую за ноч так жа настойліва перакульваў вецер. Затым з'явілася сучасная тэхніка, і мост пачалі разбіраць.

Ёсць надзея, што да Новага года будаўнікі дапамогуць БДУ ліквідаваць недахопы ў фізічным выхаванні студэнтаў. Калі моста не стане, студэнты атрымаюць магчымасць двойчы ў дзень пераадольваць шлях ад інтэрната да alma mater праз чыгуначны пераезд...

* * *

ЧАКАЕ рашэння транспартная праблема: трамвайны парк г. Мінска не спраўляецца раніцай з перавозкамі студэнтаў БДУ паміж прыпынкамі «Стадыён «Дынама» і «Вакзал». Як паведаміў нам дырэктар РВЗ, выпуск гумавых трамваяў пераменнай ёмістасці не плануецца. Выйсце бачыцца нам у адмове ад транспартнага сродку.

Прапануем мехмату і ФПМ правесці разлікі і высветліць, ці кампенсуе эканомія трох мінут часу страты нерваў і гузікаў у трамваі і на прыпынку.








# ЯК ТАНЦУЮЦЬ У ДЫСКАТЭЦЫ

МЫ РАСКАЖАМ вам адну маленькую не вельмі вясёлую гісторыйку. Яна высвечвае праблему прадстаўнікоў іншапланетных цывілізацый у ажыццяўленні кантакту ў некаторых пунктах, якія выбраны імі выпадкова.

Уявіце сабе, што на дах будынка апускаецца нешта накшталт лятальнай талеркі. А будынак той калоціцца і трасецца. Гэта вельмі цікава яму. Неверагодным чынам без білета і знаёмстваў ён прасочваецца ў памяшканне, карацей, у студэнцкую дыскатэку. Дзе танцуюць. І дзе яго зусім не палохаюцца і нават не заўважаюць, настолькі ўсе захоплены рок-н-ролам. Іншапланецянін не пужаецца іх таксама. Ён спрабуе заняцца справай — устанавіць кантакт. Хаця яму няма куды ставіць свае штукі, якія мы маглі б назваць нагамі. І дыхаецца яму кепска, хаця ён у скафандры. «Як яны карагодзяцца?» — узнікае ў яго заканамернае пытанне. Не інакш тут маецца нейкая сувязь паміж іхнімі целарухамі».

Ён пакутліва спрабуе разгадаць іх шыфр. І таксама пачынае танчыць, гэта значыць выпісваць такія ж мудрагелістыя крэндзялі. Ён хоча зразумець іх сэнс, старанна паўтарае іх. І так усё аддзяленне. Трыццаць мінут. Трыццаць мінут яго незямны розум спрабуе марна разгадаць мову зямлян. На што ў яго затрачваецца ўвесь запас энергіі, і ён, зразумела, без яе валіцца. Карацей, талерка яго сірацее...

Хочацца ў сувязі з такім сумным вынікам заклікаць: «Грамадзяне людзі! Будзьце людзьмі! Не забівайце сваімі танцамі іншапланецян!»

Завяршылася першая пяцігодка ЛІФТа. Аб якасці і эфектыўнасці яго працы меркаваць Вам, паважаныя таварышы. Хочацца, каб нашы добрыя адносіны заставаліся і ў 1986 годзе добрымі, калі не выдатнымі. Са свайго боку мы гэта абяцаем.

ЛІФТ віншуе свайго чытача з Новым годам і прапануе святочны выпуск. Аб студэнцкіх калядках расказаў А. Шапран, у дыскатэцы танчыла Т. Рудкоўская, аб навінах студгарадка паведаміў У. Дзікі, тры хвіліны разважаў А. Ленкін, кантралёрам працавала А. Віхрова, размалёўвалі выпуск А. Ленкін, І. Савосценка. Дзяжурыла А. Віхрова.

БЕЛАРУСКІ УНІВЕРСІТЭТ

Мінская паліграфічная фабрыка «Красная звезда» МВПА імя Я. Коласа.

26 снежня 1985 г.

Зак. 3283. АТ 13912.

220080, Мінск-80, УНІВЕРСІТЭЦКІ ГАРАДОК, ВУЛ. БАБРУЙСКАЯ, 9, ПАВЕРХ 4, ПАКОІ 72-73. ТЭЛЕФОН 20-68-27.

Рэдактар В. П. ВАРАБ'ЕЎ.